# БЕЛАРУСКАЯ ЭТНАЛОГІЯ Ў АСОБАХ: МІХАІЛ ФЁДАРАВІЧ ПІЛІПЕНКА
# FAMOUS BELARUSIAN ETHNOLOGIST: MICHAIL FEDARAVICH PILIPENKA

Бачыла Ірына Генадзьеўна,
Мінск, Беларусь

Ключавыя словы: этнолаг, гісторык, беларуская этналогія, культура беларусаў.

Рэзюмэ. Ахарактарызаваны ўклад выбітнага беларускага даследчыка М.Ф. Піліпенкі ў развіццё айчыннай этналогіі. Прадстаўлены біяграфічныя звесткі пра вучонага, звернута ўвага на яго навуковыя публікацыі і ўнёсак у распрацоўку прыярытэтных пытанняў этналагічнай навукі.

Keywords: ethnologist, historian, belarusian ethnology, culture of Belarusians.

Summary. The author characterizes the scientific heritage of M. Pilipenka and his contribution to the development of national ethnology. Attention has been paid to the biographical data of the researcher, his scientific publications and contribution to the development of priority problems of ethnological science.

У бягучым годзе свой 85-гадовы юбілей адзначае вядомы айчынны этнолаг і гісторык, член-карэспандэнт Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, доктар гістарычных навук, прафесар Міхаіл Фёдаравіч Піліпенка. Яго імя трывала ўвайшло ў гісторыю беларускай этналагічнай навукі і займае ў ёй пачэснае месца.

Міхаіл Фёдаравіч нарадзіўся на Гомельшчыне, у вёсцы Нежыхаў. Першыя падзеі жыцця, якія яму запомніліся, былі няпростымі, але вельмі важнымі і істотнымі. Асабліва для чалавека, пачынаючага жыццё: «Немцы прыйшлі ў першы раз вялікай групай у вёску. Усіх сагналі ў адну хату, трымалі вельмі доўга, а потым хацелі спаліць... Прайшло некалькі месяцаў. Мы зноў убачылі немцаў у вёсцы. На гэты раз яны прыехалі ўжо з пэўнай мэтай гэтую вёску знішчыць, а людзей забіць….Усе пабеглі ў той канец вёскі, дзе хаты яшчэ не гарэлі. Я быў зусім малы.

Мы скіраваліся праз хмызнякі і ўбачылі, як гарыць вёска… Вярнуліся… і ніводнай хаты. Людзі, якія не збеглі, былі забіты. Я нават пах смерці адчуваў. Засталося гэта на ўсё жыццё…» [2].

Пасля вызвалення Беларусі Міхаіл Фёдаравіч апынуўся ў дзіцячым доме ў пяці кіламетрах ад Брагіна. Гады вучобы ў школе былі няпростымі: па сорак чалавек у класе, адзін буквар на ўсіх. Але гэта не стала перашкодай. Імкненне вучыцца, спасцігаць новыя веды брала сваё. Вучоба ішла выдатна. Складаныя ўмовы жыцця ў дзіцячым доме не абазлілі яго, наадварот, хлопец з аптымізмам глядзеў у будучыню і яшчэ тады ўпэўніўся, што менавіта адносіны да жыцця і асабісты настрой чалавека вызначаюць яго лёс [1].

Пасля заканчэння сямігадовай школы Міхаіл Фёдаравіч падае дакументы ў Мазырскае педагагічнае вучылішча. Вучоба давалася лёгка, ён з задавальненнем вёў актыўную грамадскую дзейнасць. На другім курсе яго выбралі кіраўнікам камсамольскай арганізацыі. Гэтыя абставіны ў значнай ступені абумовілі далейшы лёс даследчыка: «Я вырашыў, што буду паступаць на гістарычны факультэт. За той час, што я знаходзіўся ў дзіцячым доме, кіраваў камсамольскай арганізацыяй у педвучылішчы, мною быў набыты багаты вопыт грамадскай дзейнасці. Я вырашыў рыхтаваць сябе да сацыяльнай работы, каб прыносіць карысць людзям, дзяржаве. А які прадмет найбольш добры для грамадскай дзейнасці, каб жыццё людзей зрабіць лепшым? Канешне, гісторыя» [2]. Так, у 1956 г. Міхаіл Фёдаравіч стаў студэнтам гістарычнага факультэта Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта. Пра навуковую работу ён стаў задумвацца на трэцім курсе: захапляла вялікая колькасць навук, якія выкладаліся ва ўніверсітэце. Ён з энтузіязмам удзельнічаў у працы студэнцкіх гурткоў, прымаў удзел у канферэнцыях. Навуковая дзейнасць настолькі яго захапіла, што пасля адпрацоўкі ў школах Віцебскай і Гомельскай абласцей ён вырашыў паглыбіць свае веды ў гістарычнай галіне. Міхаіл Фёдаравіч паступае ў аспірантуру Маскоўскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя М.В. Ламаносава, дзе прыступае да вывучэння сям'і і шлюбу ў беларускіх сялян у другой палове XIX – пачатку XX стст. Вынікі даследавання былі пакладзены ў аснову кандыдацкай дысертацыі, якую М.Ф. Піліпенка паспяхова абараніў.

У 1967 г. малады вучоны вяртаецца ў альма-матэр, але ўжо ў якасці выкладычка: чытае шэраг аўтарскіх курсаў («Этнаграфія», «Этнаграфія Беларусі», «Метады этнаграфічных даследаванняў»), кіруе навукова-даследчай працай студэнтаў, працягвае самастойныя даследаванні па шэрагу актуальных праблем этналагічнай навукі. М.Ф. Піліпенка ніколі не выстаўляў напаказ свае навуковыя дасягненні. Яго заўсёды турбавала толькі тое, што яшчэ ён павінен зрабіць на карысць беларускай этналогіі. Так, больш за 15 гадоў даследчык прысвяціў вывучэнню адной з самых складаных і вельмі актуальных праблем – этнагенезу беларусаў. Галоўную ролю ў гэтым выбары адыграла не імкненне атрымаць чарговую навуковую ступень і званне, а шчырае жаданне знайсці абгрунтаваны адказ на складанае пытанне «Як сфарміраваўся беларускі этнас?». Даследаванне праблемы ён сумяшчаў з выкладчыцкай працай. Для таго, каб вывучыць этнагенез беларусаў, яму неабходна было авалодаць ведамі аб паходжанні іншых этнасаў. Здабытыя веды вучоны выкарыстоўваў у лекцыях, тым самым узбагачаючы іх. Вынікам шматгадовай працы стала новая канцэпцыя, выкладзеная ім у манаграфіі «Узнікненне Беларусі: Новая канцэпцыя» (1991). Міхаіл Фёдаравіч вызначыў, што этнічная тэрыторыя сучаснай Беларусі сфарміравалася ў познім сярэднявеччы ў

выніку кансалідацыі паўночнай часткі «палескага» і паўднёвай часткі падзвінска-дняпроўскага субэтнасаў агульнаславянскай старажытнай рускай этнічнай супольнасці. Гэтыя часткі ўсходнеславянскага насельніцтва саставілі аснову беларускага этнасу. У яго склад уліліся таксама асобныя групы заходнеславянскага (польскага), балцкага і цюркскага насельніцтва. У 1993 г. навуковец абараніў гэтую працу ў якасці доктарскай дысертацыі.

На пачатак 1990-х гг. прыйшоўся пераход М.Ф. Піліпенкі на працу ў Інстытут мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору НАН Беларусі, дзе з 1994 па 2004 г. ён займаў пасаду дырэктара. Працаваў сумленна і прадуктыўна, дэманструючы талент актыўнага і адказнага кіраўніка, вучонага. У 1994 г. Міхаіл Фёдаравіч быў абраны членам-карэспандэнтам Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, а ў 1999 г. яму было прысвоена званне «Заслужанага дзеяча культуры Рэспублікі Беларусь».

Працяглая праца М.Ф. Піліпенкі на ніве айчыннай этналогіі знайшла сваё адлюстраванне на старонках шматлікіх навуковых публікацый. Сярод іх варта адзначыць наступныя: «Сляды родавай арганізацыі ў вясельных звычаях славянскіх народаў» (1969), «Сям’я і шлюб у беларускіх сялян у другой палове XIX – пачатку XX ст.» (1970), «З гісторыі вывучэння беларускай этнаграфіі і фальклору» (1970), «Даследаванні па гісторыі беларускай этнаграфіі» (1974), «Этнаграфія ў краязнаўстве» (1980), «Этнаграфія Беларусі» (1981), «Сучасныя этнічныя і культурна-бытавыя працэсы ў Беларусі» (1982), «Роля эвалюцыі і дыфузіі ў гісторыі традыцый» (1990), «Узнікненне Беларусі: Новая канцэпцыя» (1991), «Беларуская традыцыйная культура як феномен еўрапейскай цывілізацыі» (1995), «Сучасныя тэарэтычныя праблемы беларускай этналогіі» (2011) і інш. Ён удзельнічаў у падрыхтоўцы фундаментальнай шматтомнай серыі «Беларусы», а таксама такіх выданняў як «Беларуская савецкая энцыклапедыя», кароткая энцыклапедыя «Беларуская ССР» у 5 тамах, «Энцыклапедыя літаратуры і мастацтва Беларусі», энцыклапедычны даведнік «Беларусь», энцыклапедыя «Этнаграфія Беларусі» [3, с. 124].

Годныя вынікі мае праца прафесара ў галіне падрыхтоўкі навуковых кадраў вышэйшай кваліфікацыі. Пад яго кіраўніцтвам абараніліся 3 дактары і 12 кандыдатаў навук. Уражвае разнастайнасць праблемнага поля падрыхтаваных дысертацый – асобныя кампаненты традыцыйнай культуры беларусаў, этнічныя групы, культура прывілеяванага саслоўя, навуковая спадчына польскіх этнолагаў пачатку XX ст., гістарыяграфія айчыннай этналогіі. М.Ф. Піліпенка ганарыцца сваімі вучнямі, якія на сённяшні дзень працуюць у Нацыянальнай акадэміі навук і вышэйшых навучальных установах краіны. З 2008 г. па запрашэнню свайго вучня, загадчыка кафедры этналогіі, музеялогіі і гісторыі мастацтваў гістарычнага факультэта БДУ Т.А. Навагродскага, прафесар М.Ф. Піліпенка на працягу некалькіх гадоў чытаў студэнтам аўтарскі курс «Этнічная гісторыя Беларусі». За шматгадовую добрасумленную працу і вялікі асабісты ўклад у развіццё БДУ Міхаілу Фёдаравічу ў 2016 г. было прысвоена ганаровае званне «Заслужаны работнік БДУ». Сёння вучоны працягвае працаваць: з’яўляецца галоўным навуковым супрацоўнікам Дзяржаўнай навуковай установы «Цэнтр даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры НАН Беларусі», кіруе саветам па абароне дысертацый.

Міхаіл Фёдаравіч Піліпенка ўнёс істотны ўклад у развіццё айчыннай этналогіі. Яго даследаванні адрознівае высокі навуковы ўзровень, а іх вынікі і сёння

працягваюць уплываць на працэс падрыхтоўкі спецыялістаў у галіне этналогіі і гісторыі ў навуковых і навукова-педагагічных цэнтрах краіны.

Літаратура

1. Бачыла, І. Г. Вядомы этнолаг і гісторык. Да 80-годдзя члена-карэспандэнта НАН Беларусі М. Ф. Піліпенкі / І. Г. Бачыла // Навука. – №20. – 16 мая 2016. – С. 7.
2. Запісана аўтарам ад М.Ф. Піліпенкі (11.04.2016).
3. Лакотка, А. І., Чаквін, І. У., Навагродскі, Т. А. Міхаіл Фёдаравіч Піліпенка (Да 70-годдзя з дня нараджэння) / А. І. Лакотка, І. У. Чаквін, Т. А. Навагродскі // Известия Национальной академии наук Беларуси. Серия гуманитарных наук. – 2006. – № 2. – С. 123–124.